

ЗАПРАШАЕМ НА КАДЭЦКІ БАЛЬ 5

ХТО ПЕРШЫ СУСТРАКАЕ НОВЫ ГОД? 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

28 СНЕЖНЯ 2019 г. СУБОТА № 246 (29113)

# ДЗЕЛЯ ІХ ШЧАСЛІВАЙ БУДУЧЫНІ

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у навагодняй акцыі «Нашы дзеці»

**У Палацы Рэспублікі ўчора было асабліва шматлюдна і весела. Фае і канцэртны зал напоўніліся дзіцячым гоманам і смехам. Сярод натоўпу па-вайсковаму стрымана і крыху саромеючыся стаяць трое сувораўцаў — яны ўпершыню на Прэзідэнцкай ёлцы. Кожны з хлопцаў найлепшы ў сваёй справе. Яраслаў Бураўскі і Міхаіл Сімчанка — выдатнікі ў роце па вучобе, а Антон Дранец — найлепшы па спорце. Для выхаванцаў кадэцкага корпуса адыходзячы год стаў асаблівым. Яны вырашылі звязаць жыццё з вайсковай службай і зрабілі першы крок да сваёй мары, годна вытрымаўшы ўступныя іспыты ў Мінскае суворáўскае ваеннае вучылішча.**

Пра імкненне да сваёй мэты і пра тое, што ўсё залежыць ад нас саміх, гаварыў і Прэзідэнт у сваім выступленні на дабрачынным свяце ў рамках акцыі «Нашы дзеці». Ён запэўніў, што ў кожнага атрымаецца ўсё, калі быць моцным і настойлівым.

Кіраўнік краіны расказаў, што выступае і ў ролі пераемніка Дзеда Мароза, падорыць падарункі ўсім дзецям, хто яшчэ не атрымаў сюрпрыз ад галоўнага навагодняга чараўніка. Кожнаму ўдзельніку свята пасля прадстаўлення дасталіся цукеркі, набор ёлачных цацак і мяккае плюшавае мышаня, сімвал будучага года. Але Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што падарункі, як і іншае найлепшае ў жыцці, залежыць толькі ад нас саміх. «Калі вы гэтага моцна захочаце і нешта для гэтага зробіце, абавязкова ўсё атрымаеце», — запэўніў лідар краіны.

СТАР. 2



Фота БелТА.




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



Фота БелТА.

Ад прадзедаў

## КАПЯЛЮШ З ПЯРОМ,

### або Чаму павіццеўская сваццы не саступае лелікаўскай

**Летась вясельны касцюм сваццi з Кобрынскага раёна набыў статус гісторыка-культурнай нематэрыяльнай спадчыны краіны. У Дзяржаўны спіс каштоўнасцяў ён унесены як касцюм лелікаўскай сваццi. Але ў суседнім з Лелікавам Павіцці з такой фармулёўкай не вельмі пагаджаюцца, бо іх касцюм, на думку мясцовых вяскоўцаў, нічуць не горшы і мае такую ж багатую гісторыю.**

СТАР. 12



Касцюмы сваццi з «вочкамі».

ISSN 1990 - 763X